М.В. Грудзінава (Мінск)

Прыёмы карыкатуры ў аповесці Язэпа Драздовіча “Вялікая шышка”

Агульнапрызнаным фактам у гісторыі беларускай культуры стала сцвярджэнне ўнікальнага характару таленту Язэпа Драздовіча (1888–1954), які працаваў і на ніве выяўленчага мастацтва, і як ілюстратар, і ў галіне педагогікі, і ў якасці этнографа, і спрабаваў свае сілы ў літаратурнай творчасці. Аднак да гэтай пары шматграннасць дару Я. Драздовіча застаецца неасэнсаванай: культуролагі спрачаюцца наконт стылістыкі ягоных жывапісных і графічных твораў (ці з’яўляецца Я. Драздовіч мастаком інсітнага складу, ці прыхільнікам і распрацоўшчыкам у беларускай культуры стылю мадэрн), вучоныя-астраномы крытыкуюць ягоныя касмалагічныя гіпотэзы, а літаратурная спадчына Я. Драздовіча да гэтага часу застаецца амаль па-за ўвагай даследчыкаў.

Разам з тым, выключнасць таленту Я. Драздовіча заключаецца ў генетычнай непадзельнасці яго складнікаў, візуальнага і вербальнага, якія аб’ядноўваюцца адной ідэяй, адным творчым парываннем, адным поглядам на свет і адрозніваюцца сродкамі выражэння думкі. Сувязь паміж вербальным і візуальным пачаткамі можна прасачыць праз прызму паняцця *інтэрмедыяльнасці*, якім у навуцы акрэсліваецца ўзаемадзеянне розных відаў мастацтва. Пытанне суіснавання мастацтваў – не новае: кожная эпоха вырашала дадзеную праблему ў адпаведнасці з пануючай навуковай парадыгмай. Інтэрмедыяльны падыход, які аформіўся яшчэ ў 50–60-я гг. XX ст., грунтуецца на фундаментальным пастулаце аб тым, што ўвесь *свет з’яўляецца тэкстам*, і тэксты карэлююць паміж сабой (на гэты пастулат абапіраецца і тэорыя інтэртэкстуальнасці). Аднак калі тэорыя інтэртэкстуальнасці (у сваім вузкім разуменні) засяроджваецца на даследаванні ўзаемадзеяння вербальных тэкстаў, то інтэрмедыяльны падыход дазваляе прасачыць сувязі, якія існуюць не толькі паміж вербальнымі тэкстамі, але і паміж рознымі па сваёй прыродзе з’явамі (відамі мастацтва), а таксама спецыфічнымі элементамі “мастацкай формы таго ці іншага мастацтва”, якія і характарызуюцца як медыі [3, с. 7].

На прыкладзе аповесці Я. Драздовіча “Вялікая шышка” паспрабуем выявіць сувязь твора з жанрам карыкатуры. Карыкатура (ад італ. caricare – “нагружаць”, “перабольшваць”) – гэта скажонае адлюстраванне ў малюнку, літаратурным творы асобы, падзеі або прадмета. Жанр карыкатуры мае даволі працяглую гісторыю: яшчэ ў старажытнасці воіны выкарыстоўвалі высмейванне свайго праціўніка ў якасці зброі. Наступным крокам стала “візуалізаванне” слоўнай сатыры: на старажытнаегіпецкіх папірусах знойдзены карыкатуры на фараона Рамзэса III, на прадметах хатняга ўжытку,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

што паходзяць са Старажытнай Грэцыі, нанесены дасціпныя малюнкі, якія высмейваюць багоў і герояў. Нават у часы Сярэднявечча карыкатура не губляла сваіх пазіцый. Але сапраўднага росквіту яна дасягнула ў эпоху Рэнесансу, наблізіўшыся да сучаснага разумення гэтага жанру. З часоў Адраджэння карыкатура становіцца сродкам пратэсту супраць палітычнай улады, адным са спосабаў выкрыцця грамадскіх заган і асуджэння як падзей, так і пэўных асобаў (шматлікія карыкатуры на Напалеона Банапарта "перашкаджалі" жыць імператару Францыі).

Я. Драздовіч таксама ствараў гумарыстычныя малюнкі па замове заходнебеларускіх перыядычных выданняў (часопіс "Маланка"), якія ў сваёй большасці былі накіраваны на змаганне з пануючым ладам. Таму, відавочна, Драздовіч як мастак быў добра знаёмы з асноўнымі прынцыпамі стварэння карыкатурнай выявы. Прыёмы карыкатуры Я. Драздовіч выкарыстаў і ў літаратурнай творчасці. У 1923 г. у друкарні "Віленскае выдавецтва" Б.А. Клецкіна выйшла аповесць Я. Нарцызава (псеўданім Я. Драздовіча, вытворны ад імя бацькі мастака) "Вялікая шышка", на вокладцы якой змяшчаўся аўтарскі малюнак, – малады франт, акружаны такім жа багемным натоўпам, нерухома стаіць, сцяты недарэчным касцюмам вялікай шышкі. Гэтую ілюстрацыю можна смела лічыць карыкатурнай: драздовічаўскі малюнак лаканічны, гумарыстычны (пакутніцкі твар маладога чалавека не можа не выклікаць усмешку) і "празрысты" для расчытання. Дадзеная выява расшыфроўваецца ў тэксце аповесці. Малады франт – гэта мастак Гапук (альбо Агафон, як ён сам сябе называе, згодна з новым сацыяльным статусам), які прыехаў набываць веды ў вялікі горад, і ніяк не можа вызначыцца ў сваіх меркаваннях, а ідзе шляхам прыстасавання да новых умоў. Ён спрабуе зжыцца і арганічна пачуваць сябе ў ролі вялікай шышкі, у ролі значнай асобы. Графічны вобраз Гапука – карыкатурны, па законах карыкатуры выбудоўваецца і літаратурны вобраз героя.

Галоўны прынцып карыкатурнага адлюстравання – скажэнне, што дасягаецца некалькімі спосабамі, адным з якіх з'яўляецца *гіпербалізацыя*: Я. Драздовіч ужо ў загалоўку твора ўказвае на яе – "Вялікая шышка". Гапук беспадстаўна перабольшвае значэнне ўласнай асобы, свой талент, сваё фінансавае становішча і багацце ўнутранага свету. Скажонасць вобраза Гапука становіцца заўважнай пры яго супастаўленні з вобразам пабрацімца, сябра дзяцінства Альфука, а таксама праз характарыстыкі, якія даюць герою іншыя асобы: "Такая, пне, вялікая шышка, Ага-Гахвонавіч, а ў мяне дурнога мужыка грошы просе… Цілігент з таланам. Калі-ж ты талан, чаму-ж ты ня жывеш са свайго талану, сярод сваіх там цілігентаў? – ды не, а засуваеш свой цілігенцкі нос у маю мужыцкую кішаню?" [1, с. 11]. Паглыбляецца эфект

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

перабольшвання і выкарыстаннем неадпаведнай высокай тэме мастака і мастацтва лексікі: “пустагаловы ўпыр”, “пэцкаль”, “дуралей”, “састрапаць касьцюмы”.

Іншым прыёмам карыкатурнага скажэння з’яўляецца *схематызацыя* вобраза: аўтар канцэнтруе ўвагу на адной важнай рысе, якая будзе вар’іравацца на працягу ўсяго твора, адкідваючы і ігнаруючы астатнія прыкметы. Карыкатурны вобраз нельга назваць шматгранным – у аповесці Я. Драздовіча дамінантнай рысай, даведзенай да гранічнай кідкасці, з’яўляецца манія велічы ў розных сваіх праявах. Менавіта вакол гэтай заганы выбудоўваецца сюжэт твора, які разгортваецца ад пытання асабістай велічы і даходзіць да праблем сацыяльна-культурнага жыцця. Гапук увесь час падкрэслівае сваё высокае становішча, адмаўляючы мужыцкае паходжанне, што становіцца прычынай канфлікту паміж сябрамі (традыцыйны канфлікт, выяўлены яшчэ В. Дуніным-Марцінкевічам у “Пінскай шляхце”): “Што я, то ня ты, а што ты, то ня я. Вялікая розьніца між намі” [1, с. 18]. Такім жа вялікім адчувае сябе Гапук і ў творчасці, выступаючы супраць традыцыйнага мастацтва. Ён захапляецца новымі тэндэнцыямі ў культуры і кіруецца сваімі поглядамі нават ў выбары касцюма для балю мастакоў: “Ты, кажа, прафан у гэтай справе. Ня будзь паўтораю другіх і ня слухай, хто там дзе што табе кажаць, а паслухай лепш мяне, бо я больш твайго знаю, і магу цябе паўчыць… што найарыгінальней, тое і найцікавей. Касьцюм-шышка нятолькі арыгінален, але і футурыстычан. І, калі мы, апранутыя ў гэтыя шышкі, выступім, то мы арыгінальнасьцю сваіх касьцюмаў зробім вялікае сэнсацыйнае ўражэньне на ўсіх” [1, с. 16]. Баль мастакоў – кульмінацыя аповесці – з’яўляецца сапраўдным карнавалам, на якім адбываецца “адкрыццё” праўды: Гапука чакае не проста расчараванне артыстычнае (замест таго, каб уразіць, касцюм героя стаў прадметам кпінаў і здзекаў), але і асабістая драма (пабраціміц Альфук, не дараваўшы нанесенай яму абразы, “адбіў” каханую дзяўчыну Адэлю). Я. Драздовіч, высмейваючы пыху героя, выкарыстоўвае самы распаўсюджаны тэатральны камічны эфект – падзенне: заблытаўшыся ў сваім касцюме (такім жа чынам персанаж заблытаўся ў сваім жыцці), Гапук паваліўся і не змог падняцца, зрабіўшы на публіку такое ўражанне, “якое могуць рабіць толькі хворыя падучай хваробай” [1, с. 32].

Касцюм зрабіў адваротны эфект, таму што вялікая шышка – гэта новае мастацтва, маштабнае, але адарванае ад жыцця. Нездарма зняць гэтае ўбранне герою прапаноўвае “былы настаўнік і друг” Гапука, мастак-дэкадэнт Разора, за вобразам якога хаваецца сам Я. Драздовіч (Разора – адзін з псеўданімаў мастака): “Пакінь ты, братко, гэтую сваю маскарадную “адзежу”. Давай пойдзем у закулісьсе, там я памагу табе асвабадзіцца ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гэтага твайго дуралейскага касьцюму, каб ты больш у ім не мучыўся і ня выводзіў сябе на сьмех і сорам” [1, с. 32].

Вобраз вялікай шышкі ў аповесці – ключавы і з’яўляецца сімвалам, які “аб’ядноўвае ў творы ўвесь ланцуг падзей” [2, с. 127]. Вялікая шышка – гэта сімвал пыхі, сімвал сацыяльнай няроўнасці і сімвал новага, дэкаратыўна багатага, але пустога мастацтва.

Гапук увесь час выклікае смех, што адпавядае законам жанру карыкатуры: нават самыя шчырыя ягоныя душэўныя парыванні выглядаюць камічнымі і недарэчнымі. Прызнанне ў каханні, прамоўленае Гапуком пасля фатальнага балю мастакоў, выглядае залішне тэатралізаваным, празмерна дэманстрацыйным і парадыйным, асабліва, калі ўлічыць абставіны (заляпаны брудам Гапук, ажыўленая вуліца): “Крухнулі ўсе мае моцныя падмуроўкі, што я закладаў пад бажніцу майго з ёю каханьня. Напрасна, зусім напрасна я так шчыра надрываў свае сілы, закладаючы іх з цяжкога каменьня… І ці ня дзівак-жа з цябе, ты бесталковы, Гапук? Альфук, таварыш твой, каторага ты перад ёю заціраў і заўсёды стараўся паставіць яго ў ейных вачох, як нікчэмніка, перамог цябе. Ён пачаў будаваць завальню свайго з ёю каханьня ні з векавечнага каменьня, як ты, а проста з хуткатаючага сьнегу і лёду і ён, ён змог ейнае сэрца. Ён змог ёйнае слабое сэрца і перамог цябе!..” [1, с. 45]. Пачуўшы такі маналог, выпадковыя гледачы выносілі свае “вердыкты” закаханаму: “п’яны”, “апутаны ідэямі-фікс”, мае “галюцынацыі слыху”.

Аповесць Я. Драздовіча не вылучаецца глыбокім псіхалагізмам, герояў складана назваць супярэчлівымі асобамі, часцей у іх характарах дамінуе толькі адна вызначальная рыса – альбо дабро, альбо зло. І калі раптам учынкі герояў перастаюць умяшчацца ў рамкі “альбо-альбо” (станоўчы Альфук не зусім добра паводзіць сябе ў дачыненні да пабрацімца), аўтар вяртае персанажаў у схему “палярнасці”. Ёсць герой, і ёсць антыгерой, чорнае і белае – як у газетнай карыкатуры. “Аднамерныя героі” не парушаюць гумарыстычнага характару твора, не выбіваюцца з простага сюжэта, у якім, аднак, ёсць прыемныя “неспадзяванкі” (так, Альфук сцвярджае, што ягоны бацька – гэта на самой справе бацька Гапука і наадварот).

Як і ў выяўленчай карыкатуры, у карыкатуры літаратурнай выкрываюцца пэўныя чалавечыя, а галоўным чынам грамадскія заганы. Я. Драздовіч праз вобразы Гапука і Альфука здолеў паказаць канфлікт паміж чалавечай пыхай і сціпласцю, напружанасць паміж горадам і вёскай, паміж традыцыяй і новым мастацтвам. Акрамя таго, карыкатура выконвае дыдактычную ролю. Павучальнай сентэнцыяй падсумоўвае тэкст сваёй аповесці і Я. Драздовіч: “Не стварай сабе куміра / Ні з сурдута, ні з мундзіра, / А ні з шоўкавага плацьця, / А ні з якага багацьця. / Не стварай яго у “мэце” /

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ні ў натуры, ні ў партрэце. / <…> Ні з гарсэту, ні з манішкі / Ні з вялікай, нават, шышкі” [1, с. 58].

Аповесць Я. Драздовіча “Вялікая шышка” пасля публікацыі не стала значнай падзеяй у літаратурным свеце, аднак, з’явілася важнай падзеяй у творчым жыцці аўтара: акрылены даволі прыязным стаўленнем да сваіх літаратурных спробаў (вядомы крытык У. Самойла ўказваў на наватарскі характар аповесці), творца пісаў і ў наступныя гады, пацвярджаючы тым самым народную мудрасць: “Таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім”.

Літаратура

1. Нарцызаў, Я. Вялікая шышка / Я. Нарцызаў. – Вільня : Віленскае выдавецтва Б. Клецкіна, 1923. – 64 с.

2. Мароз, К.М. Язэп Драздовіч як мастак слова / К.М. Мароз // Краязнаўства як адзін з накірункаў вучэбна-выхаваўчай работы ў школе і ВНУ : матэрыялы рэсп. навук. канф., Брэст 28-29 сак. 2008. ; пад агул. рэд. У.А. Сенькаўца. – Брэст, 2008. – С. 123–129.

3. Тимашков, А.Ю. Интермедиальность как авторская стратегия в европейской художественной культуре рубежа XIX-XX веков : автореф. дис. ... канд. искусств / А.Ю. Тимашков ; СПбГУП. - СПб., 2012. – 24 с.

4. Хамадах, М. Карикатура в периодической печати : автореф. дис. ... канд. филол. наук / М. Хамадах ; БГУ. - Минск, 1994. – 23 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ